# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 14 кастрычніка 1999 года, чацвер, № 15 (1807)


Сёння Беларусь святкуе Дзень маці. У нашым універсітэце гэтае свята таксама не праміне незаўважаным. Жанчыны пачуюць шмат віншаванняў і шчырых слоў падзякі ад родных і знаёмых. Сын прытуліцца да сваёй матулі, муж ад усяго сэрца расцалуе сваю жонку, а юнак, вядома ж, падорыць вялізны букет сваёй дзяўчыне — будучай маці.

У гэтае цудоўнае свята хочацца шчыра павіншаваць усіх жанчын і пажадаць ім здароўя, сапраўднага кахання, поспехаў у працы і, канешне, шчаслівых і ўдзячных дзяцей.

**СВЯТЫ**

## ДЗЕНЬ МАЦІ

Дзень 14 кастрычніка не адзначаны ў календары чырвоным колерам. Але ён варты асобнай увагі, бо гэта — Дзень маці.

У нашым універсітэце гэты дзень таксама будзе адзначацца. Арганізатарам святкавання выступіў Саюз жанчын БДУ. Ён падрыхтаваў для жанчын не толькі святочную праграму, але і кансультацыі псіхолагаў і юрыстаў, паслугі цырульнікаў і візажыстаў. А Цэнтр сацыяльнай падтрымкі Саюза жанчын рэспублікі 12 кастрычніка правеў бясплатныя кансультацыі для студэнтаў, якія маюць дзяцей.

Цэнтральнай падзеяй святкавання стане “агеньчык”, які пройдзе 15 кастрычніка ў сталовай інтэрната № 5. Саюз жанчын БДУ распаўсюджвае запрашальнікі сярод супрацоўніц, а найперш — сярод шматдзетных маці. У праграме мяркуюцца канцэртныя выступы калектываў БДУ. Кожнаму прысутнаму будуць уручаны памятныя сувеніры і кветкі.

Для нядаўна створанага Саюза жанчын БДУ гэтае мерапрыемства — дэбют. І вядома ж, арганізатары будуць старацца правесці свята на высокім узроўні.

*Ірына НІКАЛАЕВА*

**З НАГОДЫ**

## СТУДЭНЦКАЯ СЯМ’Я

Напярэдадні Дня маці жанчыны універсітэта ўжо рыхтуюцца пачуць мноства цёплых слоў. Аднак хочацца сказаць і аб праблемах, з якімі сутыкаюцца маці-студэнткі, сямейныя студэнткі. А клопатаў хапае: забяспечыць сям’ю інтэрнатам, атрымаць сямейныя пуцёўкі на аздараўленне, па магчымасці дадаць да сямейных даходаў матэрыяльную дапамогу. Усе гэтыя пытанні разглядае і вырашае прафком студэнтаў БДУ.

Апрача таго, прафсаюзны камітэт стаў ініцыятарам ідэі пра вылучэнне некалькіх паверхаў якога-небудзь інтэрната для пражывання студэнцкіх сем’яў. На жаль, пакуль толькі ў выглядзе праекта існуе ідэя стварэння ў блоках своеасаблівага дзіцячага пакоя, дзе маці змагла б са спакойным сэрцам пакінуць дзіця на час заняткаў. У далейшым прафком плануе таксама арганізаваць працу выхавальніка і педыятра. А ўжо зараз супрацоўнікі студэнцкага прафсаюзнага камітэта дапамагаюць маладым сем’ям атрымаць месцы для дзяцей у яслях і дзіцячых садках.

На Новы год і іншыя святы прафком рыхтуе для дзяцей падарункі і матэрыяльную дапамогу. Летась, напрыклад, з маладымі мамамі сустракаўся дырэктар “Малочнай кухні”, і напрыканцы сустрэчы кожная маці атрымала ў падарунак пакет дзіцячага харчавання.

Прафком студэнтаў супрацоўнічае з разнастайнымі дабрачыннымі арганізацыямі. Для прыкладу, зараз існуе ідэя прыцягнуць да дапамогі студэнцкім сем’ям Чарнобыльскі фонд “Аист”. Па прадстаўленні прафкома сямейным парам будзе паступаць гуманітарная дапамога.

Дарэчы, да мерапрыемстваў, прысвечаных Дню маці ва універсітэце, прафком пастараецца прыцягнуць маладых мам-студэнтак.

*Святлана СІТНІК*

**АБ’ЯВЫ**

***Студэнцкі саюз Белдзяржуніверсітэта, Камітэт БПСМ Белдзяржуніверсітэта, Савет старастаў Белдзяржуніверсітэта***

абвяшчае конкурс сярод студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ “На лепшую гісторыю са студэнцкага жыцця”, прысвечаны Міжнароднаму дню студэнта — 17 лістапада, па наступных намінацыях:

самая праўдзівая гісторыя,
самая неверагодная гісторыя,
самая смешная гісторыя.

Прызавы фонд конкурса для кожнай намінацыі складае:

1 месца — 5 мільёнаў рублёў;
2 месца — 4 мільёны рублёў;
3 месца — 3 мільёны рублёў.

Час правядзення конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб’явы.

Творы на конкурс прымаюцца па адрасе: праспект Ф. Скарыны, 4, галоўны корпус БДУ, пакой 205, тэл. 268-70-76.

Тры лепшыя творы будуць апублікаваны ў газеце “Беларускі універсітэт”.

**АКЦЫІ**

## МОЛАДЗЬ — ВЕТЭРАНАМ

Ужо некалькі гадоў у сталіцы ладзіцца акцыя “Моладзь — ветэранам”. Мерапрыемства праходзіць у межах праграмы Мінскага гарадскога камітэта БПСМ “Міласэрнасць”.

Арганізацыя БПСМ БДУ таксама актыўна ўключылася ў правядзенне акцыі, мэта якой — дапамагчы адзінокім састарэлым людзям падрыхтавацца да зімы. Добраахвотнікі працуюць у гаспадарках Мінскага раёна, на базах гародніны ў Мінску. На заробленыя сродкі будзе закуплена гародніна для ветэранаў.

Дарэчы, да гэтай добрай справы могуць далучыцца ўсе жадаючыя. Звяртайцеся ў камітэт БПСМ БДУ (праспект Ф. Скарыны, 4, пакой 205, тэл. 268-70-76).

*Прэс-служба камітэта БПСМ БДУ*

# У НОВЫ ВЕК З НОВЫМІ ВЕДАМІ

Будучае бізнесу — гэта адукацыя, новыя веды, новыя тэхналогіі, новыя магчымасці. Цяпер іх прадастаўляе і галоўная ВНУ краіны — БДУ. БДУ, дзе адкрыты спецыяльны факультэт менеджменту і сацыяльных тэхналогій.

Так што калі вы жадаеце атрымаць добрую адукацыю і маеце вольны час, але не ведаеце, якім чынам яго размеркаваць, гэтая інфармацыя для вас можа быць не толькі карыснай, але і неабходнай.

Усім вядома, што Белдзяржуніверсітэт з'яўляецца вядучай ВНУ рэспублікі і славіцца не толькі ў нас, але і за мяжой. А сумесны дыплом "Master of Science" Інстытута эканомікі пры універсітэце штата Каларада (ЗША) і Белдзяржуніверсітэта — яшчэ адзін доказ якасці гэтай адукацыі.

Залічэнне ў магістратуру праводзіцца па выніках тэсціравання па англійскай мове і матэматыцы. Праграма ўключае 16 вучэбных бізнес-дысцыплін на працягу двух гадоў навучання. Англійская мова вывучаецца ў кожным трыместры, што дае магчымасць замацоўваць і развіваць навыкі. А само выкладанне некаторых дысцыплін на гэтай мове забяспечвае паглыбленне ў моўнае асяроддзе, характэрнае для міжнароднага бізнесу. Блокі курсаў чытаюцца выкладчыкамі Інстытута экалогіі ЗША, што дае магчымасць адчуць атмасферу амерыканскіх універсітэтаў.

Падчас навучання ў бізнес-магістратуры ў вас ёсць магчымасць сустрэцца з цікавымі людзьмі, наладжваць прафесійныя кантакты і дзелавыя сувязі.

Навучанне платнае, аднак для найбольш здольных студэнтаў існуе сістэма скідак. Так што калі вы з'яўляецеся выпускніком ВНУ, альбо студэнтам апошняга курса, альбо ўжо працуеце спецыялістам і, галоўнае, калі вы імкнецеся да развіцця сваёй прафесійнай кар'еры, сумесная амерыканска-беларуская магістратура чакае вас. Паспрабуй сябе ў нечым новым!

*Валерыя ЛУЦКОВА*



# ЖАРТЫ, СМЕХ І ДОБРЫ НАСТРОЙ

КВЗ — гэта заўсёды добры настрой, смех, жарты і вялікая колькасць станоўчых эмоцый. У сценах БДУ гэтае добрае і вясёлае мерапрыемства праводзіцца ўжо на працягу пяці гадоў. У чарговы раз "свята смеху" адбылося 4 кастрычніка 1999 года. І пасля гэтага ўсе прысутныя імгненна забыліся на звыклы і сумны выраз "Панядзелак — дзень цяжкі".

У першым паўфінале адкрытага універсітэцкага турніру "КВЗ-99" прымалі ўдзел тры каманды. Першую каманду прадстаўляў Брэст, а дзве іншыя — БДУ. А калі дакладней, лепшыя з лепшых вясёлыя і знаходлівыя з факультэтаў міжнародных адносін і радыёфізікі і электронікі. Бліскуча сыгралі госці з Брэста, дзякуючы чаму яны і выйшлі ў фінал.

У сераду 6 кастрычніка сіламі мераліся зборныя Віцебскага універсітэта, каманда "ФЭФ-2" і каманда факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, у якую ўваходзілі пераважна прадстаўніцы жаночага полу, што сустракаецца вельмі нячаста. На працягу ўсёй гульні лідзіравала каманда "ФЭФ-2", аднак пасля музычнай паўзы яе месца заняла зборная Віцебскага універсітэта, якая і выйшла ў фінал. Па рашэнні журы, у якое ўваходзілі прадстаўнікі каманды КВЗ БДУ Мікалай Анішчанка, Кірыл Цішчанка, Сяргей Алехнік, Леанід Купрыда і шэф-рэдактар Міжнацыянальнай тэлерадыёкампаніі "Мір" Тамара Вяцкая, каманда "ФЭФ-2", якая цудоўна паказала сябе, таксама трапіла ў фінал. Тыя ж каманды, якія не ўвайшлі ў фінал, атрымалі суцяшальныя прызы. А які прыз атрымае пераможца, мы даведаемся толькі ў сярэдзіне снежня, калі адбудзецца гульня фіналістаў.

Хочацца адзначыць, што на гэты раз актавая зала БДУ сабрала сапраўды вельмі шмат гледачоў і, як адзначыў рэжысёр дырэкцыі па справах культуры БДУ Сяргей Турбан, людзі проста віселі на люстрах. І гэта цудоўна, таму што смех не толькі працягвае жыццё, але і расквечвае шэрасць і будзённасць нашых дзён, напаўняючы іх яркімі колерамі.

*Валерыя ЛУЦКОВА*



# ААН + БДУ: АДКРЫЦЦЁ ДЭПАЗІТАРНАЙ БІБЛІЯТЭКІ

4 кастрычніка 1999 года ў бібліятэцы факультэта міжнародных адносін БДУ адбылося афіцыйнае адкрыццё другой у рэспубліцы дэпазітарнай бібліятэкі ААН. Яна створана ў рамках Фундаментальнай бібліятэкі БДУ пры матэрыяльна-тэхнічнай і арганізацыйнай падтрымцы сумеснага праекта "Цэнтр па вывучэнні ААН" Праграмы развіцця ААН (ПРААН), Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў (УВКБ ААН) і Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

У цырымоніі адкрыцця бібліятэкі ўзялі ўдзел рэзідэнт-каардынатар ААН у РБ Ніл Бунэ, выконваючы абавязкі Прадстаўніка УВКБ ААН у Беларусі Масака Кінашыта, начальнік упраўлення гуманітарнага супрацоўніцтва МЗС Беларусі С.С. Агурцоў, прарэктар БДУ па міжнародных сувязях і нацыянальны каардынатар праекта "Цэнтр па вывучэнні ААН" У.А. Астапенка, а таксама дэкан факультэта міжнародных адносін БДУ А.В. Шарапа. Удзельнікі цырымоніі паказалі публікацыі і матэрыялы ААН, якія ўжо паступілі ў бібліятэку, прадэманстравалі магчымасці работы з электроннымі базамі дадзеных ААН у сетцы Інтэрнэт, сістэмай аптычных дыскаў і кампакт-дыскамі. Акрамя таго, госці мелі магчымасць пазнаёміцца з выставай фотаплакатаў, прысвечаных гісторыі ААН, міратворчай дзейнасці і пытанням правоў чалавека.

Да апошняга часу адзіным дэпазітарыем дакументаў ААН у нашай краіне была Нацыянальная бібліятэка Беларусі, што атрымала гэты ганаровы статус у 1954 годзе. Аднак у снежні мінулага года Выдавецкая калегія ААН прыняла рашэнне аб назначэнні Фундаментальнай бібліятэкі БДУ дэпазітарнай бібліятэкай ААН. І ўжо сёлета дакументы ААН (на англійскай і рускай мовах) сталі даступнымі для студэнтаў і шырокай публікі. Праўда, БДУ атрымлівае толькі частковы камплект такіх дакументаў. Натуральна, асаблівую ўвагу гэтая дэпазітарная бібліятэка будзе надаваць матэрыялам і публікацыям па профілях факультэтаў БДУ. Важным элементам дэпазітарыя з'яўляецца камп'ютэрная сетка, якая мае выхад у Інтэрнэт. Наведвальнікі бібліятэкі могуць карыстацца вялікім аб'ёмам інфармацыі, змешчанай на аанаўскіх старонках у Інтэрнэт, у сістэме аптычных дыскаў ААН (United Nations Optical Disk System), а таксама на кампакт-дысках, падрыхтаваных УВКБ ААН і бібліятэкай імя Дага Хамершэльда (Нью-Йорк). Такім чынам, тэхнічная забяспечанасць і магчымасці дэпазітарнай бібліятэкі ў БДУ нашмат вышэй, чым у Нацыянальнай бібліятэцы.

Усе жадаючыя працаваць з дакументамі ААН у друкаваных і электронных варыянтах у дэпазітарнай бібліятэцы ААН на факультэце міжнародных адносін БДУ могуць звяртацца на адрас:

220072, Мінск, вул. Акадэмічная, 25, 2-і паверх, бібліятэка
тэл.: 284 00 15
факс: 284 00 13
e-mail:
selivanych@fir.bsu.unibel.by

P.S. Дарэчы, вельмі цікавае, амаль магічнае супадзенне: Фундаментальная бібліятэка БДУ стала 365-й дэпазітарнай бібліятэкай ААН у свеце. Лічба, роўная колькасці дзён у годзе. Шчаслівае гэта супадзенне ці не — пакажа час.

*Уладзімір СТАТКЕВІЧ*

# Рэспубліка "Кактэбель"

У Крыме каля падножжа згаслага вулкана Карадаг, а цяпер запаведнай зоны размешчаны дзіцячы аздараўленчы лагер "Кактэбель". На яго базе ўжо больш за сем гадоў праходзяць педагагічную практыку студэнты нашага універсітэта. Прычым адбор туды вельмі строгі: сёлета са ста жадаючых былі абраныя толькі васемнаццаць чалавек. На першым этапе прайшоў конкурс рэфератаў і сцэнарыяў мерапрыемстваў культурнага і спартыўнага накірункаў. Потым адбыліся гутарка і тэсціраванне. Але і на гэтым усё не скончылася. Сфарміраваны педагагічны атрад прайшоў курс лекцый і практычных заняткаў па педагогіцы, псіхалогіі і арганізацыі дзіцячых творчых спраў.

Не зважаючы на прымхі, 13 ліпеня педагагічны атрад прыбыў у ДАЛ "Кактэбель". Першае, што кінулася ў вочы, — плакат з надпісам "Дзіцячая Рэспубліка "Кактэбель". Ужо на планёрцы нашым важатым далі заданне падабраць кандыдатаў у прэзідэнты Рэспублікі Кактэбель, распрацаваць перадвыбарчую кампанію, забяспечыць групу падтрымкі. А ў выбарах, натуральна, удзельнічалі дзеці.

На другі дзень лагернай змены адбылася выбарчая кампанія. З гэтага дня ў лагеры з'явілася дзіцячае самакіраванне на чале з прэзідэнтам і кабінетам міністраў. Пры іх непасрэдным удзеле адбыліся многія мерапрыемствы: Дзень мора, конкурсы Афрадыт і Суперменаў, Малыя алімпійскія гульні, караоке па-кактэбелеўску і інш.



Быў і асаблівы дзень — 25 ліпеня. У гэты дзень лагеру споўнілася 40 гадоў. Яго наведалі ў гонар свята каля дваццаці дырэктараў розных лагераў Крыма, і ўсе яны звярнулі увагу на Дзіцячую рэспубліку.

А што ж нашы важатыя-практыканты? Менавіта яны арганізавалі і правялі ўсе мерапрыемствы. Паспяхова прайшоў конкурс Афрадыт, арганізаваны А. Лугаўцовым (хімічны факультэт). Адной з пераможцаў конкурсу стала Л. Марук (механіка-матэматычны факультэт). У важацкіх канцэртах вылучыліся П. Гаўрыкаў, Г. Заранская, А. Хацяновіч (хімічны факультэт), Н. Яўціхіна, М. Мартон (механіка-матэматычны факультэт), І. Жаўняровіч, Н. Патаповіч (юрыдычны факультэт). КВЗ арганізавалі П. Клімук, А. Жур, А. Насевіч (хімічны факультэт), Д. Савенкаў, В. Шукевіч (механіка-матэматычны факультэт), П. Талстых (фізічны факультэт). А калі пералічваць усе цікавыя мерапрыемствы, якія прайшлі ў лагеры, давядзецца адзначыць кожнага з педагагічнага атрада нашага універсітэта. І варта сказаць, што ў зале разам з дзецьмі заўжды было многа дарослых, якія прыходзілі паглядзець вечары, арганізаваныя нашымі важатымі, нібы на канцэрты прыезджых артыстаў.

Па выніках працы адміністрацыяй лагера "Кактэбель" была абвешчана падзяка ўсім без выключэння. А падчас Другой міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, якая адбывалася на базе ДАЛ "Кактэбель" і дзе наш універсітэт прадстаўляў прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У.Б. Аджаеў, дырэктар лагера А.М. Арлоў выказаў удзячнасць Белдзяржуніверсітэту за выхаванне і падрыхтоўку студэнтаў-практыкантаў. Загадам па універсітэце педагагічнаму атраду таксама была абвешчана падзяка.

*Руслан ПАПОК,*
*кіраўнік педагагічнай практыкі*

ПАЗІЦЫЯ

# ВЫВУЧАЦЬ ПАЛІТЫКУ ЦІ ЗАЙМАЦЦА ЁЙ?

*На сённяшні дзень у Рэспубліцы Беларусь існуе больш за 70 маладзёжных арганізацый рэспубліканскага статусу. Кожная з іх з'яўляецца групай аднадумцаў, якія аб'ядноўваюцца для дасягнення пэўных мэтаў. Не апошняе месца ў гэтым спісе займае Рэспубліканская асацыяцыя студэнтаў-палітолагаў (РАСП). Яна мусіць спрыяць студэнтам, якія вывучаюць палітычныя навукі, а таксама ўсім маладым людзям, якія выказваюць інтарэс да палітыкі, у атрыманні неабходных ведаў і вопыту ў сферы грамадска-палітычнага жыцця.*

*Для нашых чытачоў пра гэтую асацыяцыю распавядае яе выканаўчы дырэктар У.В. ПАДКАПАЕЎ.*

**— Уладзімір Віктаравіч, калі была створана ваша асацыяцыя?**

— РАСП была зарэгістравана Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь 28 жніўня 1995 года як рэспубліканская грамадская арганізацыя. У той час беларуская паліталогія як навука яшчэ толькі нараджалася. У 1992 годзе упершыню быў здзейснены набор студэнтаў на аддзяленне паліталогіі, а ў 1995 годзе група студэнтаў вырашыла арганізаваць асацыяцыю, якая б дапамагла ім "грызці граніт навукі". Так нарадзілася РАСП. Кафедра паліталогіі і, у прыватнасці, яе загадчык, доктар палітычных навук С. Рашэтнікаў аказалі маладым энтузіястам вялікую падтрымку. Асацыяцыя ад пачатку меркавалася як непалітычная і некамерцыйная арганізацыя, якая носіць навуковы і адукацыйны характар. Такой яна застаецца і зараз. Асацыяцыя дапамагае студэнтам у іх навукова-даследчай дзейнасці, спрыяе публікацыі студэнцкіх работ і выступленню студэнтаў у сродках масавай інфармацыі, павышэнню прафесійнага ўзроўню.

**— Хто ўваходзіць у вашу асацыяцыю?**

— РАСП мае дастаткова прадстаўнічы ўзровень. Члены арганізацыі жывуць у розных гарадах Беларусі: Мінску, Гомелі, Гродне і інш. Хаця большасць з іх навучаецца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, у асацыяцыі ёсць прадстаўнікі і іншых ВНУ: БДПА, ЕГУ, Наваполацкага дзяржаўнага універсітэта, Магілёўскага педагагічнага універсітэта, — а таксама асобы, якія ўжо скончылі навучанне. Цешыць тое, што праблемамі палітычнай навукі цікавяцца і студэнты іншых спецыяльнасцей — гуманітарных, тэхнічных і прыродазнаўчых. Асацыяцыя прытрымліваецца дэмакратычных прынцыпаў, таму яе члены могуць уваходзіць у іншыя грамадскія арганізацыі, мець любыя ідэі, погляды і перакананні.

**— Чым займаецца РАСП?**

— Кожны член РАСП імкнецца прыняць актыўны ўдзел у дзейнасці арганізацыі. Па чацвяргах асацыяцыя праводзіць свой штотыднёвы палітыка-філасофскі семінар "Палімпсест". У перакладзе з грэчаскай палімпсест — таблічка, з якой сцёрлі надпіс і падрыхтавалі для новага. Тут разглядаюцца і абмяркоўваюцца праблемы навуковага ці практычнага характару. У якасці

*(Заканчэнне на стар. 5.)*

# З ЦЕМРЫ – ДА СВЯТЛА...

## (З ГІСТОРЫІ СТАНАЎЛЕННЯ ВЫШЭЙШАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ АДУКАЦЫІ НА БЕЛАРУСІ)

*У адным з мінулых нумароў "Беларускага універсітэта" мы распавядалі вам пра новы факультэт нашага універсітэта – эканамічны. Але ж вышэйшая эканамічная адукацыя ў Беларусі мае сваю доўгую гісторыю. Пра гэта вы прачытаеце ў нашым матэрыяле.*

У Еўропе, бадай што, няма іншага народа, акрамя беларускага, які б прайшоў такі пакутны шлях да сваёй універсітэцкай і, перш за ўсё, вышэйшай эканамічнай адукацыі. Знаходзячыся ў цэнтры Еўропы, на скрыжаванні сусветных эканамічных, палітычных, ідэалагічных прэтэнзій, беларускі народ неаднойчы зазнаваў пераўтварэнні з суб'екта культурнага развіцця ў аб'ект барацьбы паміж культурамі Захаду і Усходу. Яму вайной і хітрасцю навязвалі ўмовы выжывання, каб не было калі думаць пра сваё культурнае развіццё. Вось чаму выдатны беларускі навуковец і асветнік Францішак Скарына, выпускнік Ягелонскага і Падуанскага універсітэтаў, так горача ўзяўся за кнігадрукаванне на роднай мове, каб узняць на належную вышыню адукацыю і асвету простага беларускага люду.

Аднак Ватыкан, перайшоўшы ў атаку на праваслаўе, выкарыстаў якраз тую зброю, якой у беларускага народа не было. Польскі кароль Стэфан Баторы, таксама выпускнік Падуанскага універсітэта, у 1578 годзе адкрыў, а Папа рымскі Рыгор XIII у 1579 годзе зацвердзіў Віленскую езуіцкую акадэмію ў складзе багаслоўскага і філасофскага факультэтаў з лацінскай і польскай мовамі навучання. Эканамічная адукацыя тут не была прадугледжана.

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 годзе і забароны ордэна езуітаў, які кіраваў Віленскай акадэміяй, тут паволі пачынаюцца пэўныя змены. Віленская езуіцкая акадэмія становіцца Галоўнай школай Вялікага княства Літоўскага ў Вільні. У 1780 годзе сюды з Варшавы прыязджае працаваць прафесар натуральнага права Еранім Страйноўскі (1752-1815). З 1783 года ён пачынае чытаць асобныя раздзелы палітычнай эканоміі. Праз два гады ў 1785 годзе ў Вільні ўбачыла свет яго кніга "Навука аб прыродным і палітычным праве, палітычнай эканоміі і праве народаў". Яна стала падручнікам, па якім, пачынаючы з 1793 года, чытаў лекцыі па палітычнай эканоміі выпускнік Галоўнай школы ВКЛ у Вільні, ураджэнец Беларусі С. Малеўскі.

У 1803 годзе палітычная эканомія вылучылася тут у самастойную дысцыпліну дзякуючы рэарганізацыі па ўказе Аляксандра I Галоўнай школы ВКЛ у Віленскі Імператарскі універсітэт. Ён становіцца цяпер не толькі вышэйшай навучальнай і навуковай установай, але і адміністрацыйным цэнтрам для ўсіх вучылішчаў Віленскай навучальнай акругі. Колькасць навучэнцаў у ёй пераўзыходзіла сумарную лічбу навучэнцаў усіх астатніх навучальных акруг Расійскай імперыі. Апекуном Віленскай навучальнай акругі быў прызначаны прадстаўнік магнацкага роду ВКЛ князь Адам Чартарыйскі (1770-1861). З яго прыходам да ўлады, з аднаго боку, пачалася паскораная паланізацыя беларускай, літоўскай і украінскай моладзі – студэнтаў Віленскага універсітэта, а з другога – стала наладжвацца эканамічная адукацыя. У 1810 годзе з улікам парад швейцарскага эканаміста Сісмонда дэ Сісмандзі ў Віленскім універсітэце была створана кафедра палітычнай эканоміі. Загадчыкам кафедры стаў выпускнік Галоўнай школы ВКЛ, ураджэнец Гродзеншчыны Ян Зноска (1772-1833). У 1811 годзе ў Вільні выйшаў з друку яго падручнік "Навука палітычнай эканоміі", а ў 1816 годзе – кніга "Даследаванне пра палітычную эканомію, яе гісторыю і сістэмы".

З 1823 па 1830 год курс палітычнай эканоміі ў Віленскім універсітэце чытаў Я. Вашкевіч. У 1830 годзе ўбачыла свет яго кніга "Навука аб гандлі", у 1836 годзе – "Гісторыя банкаў і іншых галоўных крэдытных устаноў" (абедзве на польскай мове). Пад уплывам ідэй Віленскага універсітэта ў


Т.І. Адамовіч

польскай навуковай літаратуры пачынае вывучацца жыццё мясцовага беларускага, украінскага і літоўскага насельніцтва з гістарычнага, этнаграфічнага і эканамічнага пунктаў погляду.

У 1831 годзе ў Віленскім універсітэце навучаўся 1831 студэнт, каля 80 працэнтаў з іх былі ўраджэнцамі Беларусі. Для параўнання — у Маскоўскім універсітэце навучаліся тады ўсяго 734 студэнты. І вось Віленскі універсітэт, які стаў ужо добра вядомым у Еўропе, быў зачынены 1 мая 1832 года па загадзе Мікалая I. Адначасова ім быў выдадзены ўказ аб заснаванні "в своё время" ...вышэйшага вучылішча ці ліцэя ў Оршы, які з цягам часу мог бы замяніць страчаны Віленскі універсітэт.

Аднак фінансавыя цяжкасці і палітычныя матывы прывялі да таго, што пачатая ў Оршы праца была спынена. Авансаваныя грашовыя сумы царскі ўрад перавёў на завяршэнне арганізацыі універсітэта Святога Уладзіміра ў Кіеве, які павінен быў замяніць ліцэі ў Кіеве і Оршы і стаць "умственною крепостью в близи военной для подавления духа польской национальности". Кіеўскі універсітэт быў прызначаны стаць "средоточием учебной системы всех западных губерний для окончательного образования молодых людей, подготовленных к тому в гимназиях Киевского и Белорусского округов". У 1834 годзе Кіеўскі універсітэт быў адкрыты. У яго перавялі разам з некаторымі іншымі і кафедры эканамічнага профілю Віленскага універсітэта.

Царскія чыноўнікі, якія складалі ў беларускім краі ядро русіфікатарскай і аб'ядноўчай палітыкі, нягледзячы на ўсе намаганні "проявить на русско-литовской земле присутствие русской культурной жизни", так і не змаглі стварыць ў Беларусі рускія цэнтры навукі і культуры.

Адмена прыгоннага права і развіццё капіталізму няўмольна ставілі вышэйшую адукацыю ў Беларусі ў парадак дня. Прадстаўнікі беларускай грамадскасці неаднойчы (у 1901, 1903, 1906, 1911, 1914 гадах) звярталіся да царскіх уладаў з просьбай аб адкрыцці вышэйшай навучальнай установы ў Беларусі. Апошні раз гэта было ў 1916 годзе. Нягледзячы на ваенныя дзеянні, амаль адначасова хадайнічалі перад царскім урадам Віцебская губернская зямельная ўправа, Мінская гарадская дума і Мінскае гарадское земства, каб той падараваў універсітэт аднаму з гарадоў Беларусі: Віцебску, Магілёву ці Мінску. Урад адказаў, што Віцебск і Магілёў не з'яўляюцца цэнтрамі "Северо-Западного края", а Мінск знаходзіцца блізка ад фронта вайны.

У 1918 годзе ў часе нямецкай акупацыі дэмакратычнае Мінскае губернскае земства, шэраг павятовых земскіх сходаў і гарадскіх дум спрабавалі разам з групай прафесараў закласці падмурак "Краявога храма навукі". Былі прапанаваны тры праекты універсітэта ў Мінску:

1) праект аддзела народнай адукацыі пры Мінскай губернскай земскай управе;

2) праект прафесара М.В. Доўнар-Запольскага, прадстаўлены Сакратарыяту БНР;

3) праект акадэміка Я.Ф. Карскага.

У гэтых праектах універсітэт быў сканструяваны па прынцыпе старых універсітэтаў Расіі ў складзе чатырох асноўных факультэтаў: гісторыка-філалагічнага, юрыдычнага, медыцынскага, фізіка-матэматычнага. М.В. Доўнар-Запольскі прапаноўваў і камерцыйна-эканамічны факультэт — "как имеющий большое применение и требующий мало особенных кафедр".

Пасля адступлення кайзераўскіх войскаў з Беларусі прафесар Ф.Ф. Турук, які працаваў у Белнацкаме (г. Масква), першым у пачатку лютага 1919 года загаварыў пра неабходнасць адкрыцця Беларускага універсітэта, прынцыповая магчымасць чаго была прызнана Наркамасветы РСФСР як вынік гутаркі беларускай дэлегацыі з У.І. Леніным.

11 лютага 1919 года пад старшынствам А.Р. Чарвякова адбылося першае пасяджэнне камісіі Белнацкама, на якім абмяркоўвалася прапанова Б. Тарашкевіча аб адкрыцці універсітэта ў Мінску. Пачаліся спрэчкі: большасць лічыла, што гэта рабіць яшчэ рана. А.Р. Чарвякоў сказаў, што універсітэт патрэбны, а пачынаць заўсёды цяжка. Да таго ж, ідэю адкрыцця Беларускага універсітэта падтрымаў А.В. Луначарскі.

24 лютага 1919 года Прэзідыум ЦВК БССР прыняў рашэнне аб адкрыцці універсітэта. Але пачалася белапольская акупацыя. Палякаў выгналі з Мінска 11 ліпеня 1920 года. А ў першую гадавіну вызвалення Мінска ад белапалякаў, г. зн. 11 ліпеня 1921 года, пачаліся заняткі на рабочым факультэце БДУ. 30 кастрычніка 1921 года быў урачыста адкрыты Беларускі дзяржаўны універсітэт. Ён меў пяць факультэтаў: рабочы, грамадскіх навук, медыцынскі, сельскагаспадарчы і фізіка-матэматычны. З 1 лістапада пачаліся заняткі на медыцынскім і факультэце грамадскіх навук.

Факультэт грамадскіх навук (ФГН) складаўся з чатырох аддзяленняў: этналінгвістычнага, грамадска-педагагічнага, прававога, эканамічнага. Да пачатку заняткаў кафедры ФГН былі ўкамплектаваныя пераважна выдатнымі навуковымі сіламі Маскоўскага, Казанскага, Кіеўскага, Смаленскага і іншых універсітэтаў, а часткова — сваімі сіламі. Прафесарамі былі зацверджаны: У.І. Пічэта — па кафедры рускай гісторыі; І.Я Герцык — па кафедры гісторыі сацыялізму і палітычнай эканоміі; В.В. Якунін — па кафедры фінансава-эканамічных дысцыплін; Я.Я. Святлоўскі — па кафедры статыстыкі і іншыя.

Акрамя таго, праўленне БДУ запрасіла да чытання лекцый і правядзення практычных заняткаў па эканоміцы пераходнага часу сакратара ЦК КПБ, прафесара В.Г. Кнорына.

Асноўны цяжар навучальнай нагрузкі на эканамічным аддзяленні ФГН ляжаў на дацэнце Ільі Якаўлевічы Герцыку. Ён нарадзіўся 25 жніўня 1872 года ў Магілёўскай губерні ў сям'і купца першай гільдыі. Закончыў Рыжскае вышэйшае палітэхнічнае вучылішча з пахвальным атэстатам, вучонай ступенню кандыдата камерцыйных навук і правам пражываць ва ўсіх гарадах і паселішчах Расійскай імперыі. Валодаў рускай, яўрэйскай, нямецкай і французскай мовамі. Працягваў у Берліне вывучэнне палітычнай эканоміі. Працаваў у банку. Быў давераным Мінскага і Самарскага аддзяленняў Петраградскага міжнароднага камерцыйнага банка, загадчыкам гарадской статыстыкі ў Мінску. Член Бунда з 1916 года. Чытаў лекцыі ў БДУ з 1921 па 1931 год па курсах: палітычная эканомія (35 глаў), гісторыя сацыялізму да 1848 года (16 глаў), гісторыя эканамічных вучэнняў (17 глаў), грашовае абарачэнне і крэдыт (26 глаў), тэхніка банкаўскай справы (24 главы).

У БДУ да 1928 года не было кафедры палітычнай эканоміі і кафедраў канкрэтна-эканамічных дысцыплін. Уся вучэбна-метадычная і навукова-даследчая работа была сканцэнтраваная ў эканамічнай прадметнай камісіі. Прадметная камісія займалася вучэбна-метадычнымі пытаннямі, ажыццяўляла кіраўніцтва кабінетамі, распрацоўвала вучэбныя планы, праграмы курсаў, зацвярджала спісы літаратуры, рэкамендаванай студэнтам, заслухоўвала справаздачы навуковых супрацоўнікаў, абмяркоўвала навуковыя даклады і вынікі НДР. Эканамічную прадметную камісію ўзначальваў рэктар БДУ прафесар Уладзімір Іванавіч Пічэта.

У лютым 1925 года БДУ выпусціў для рэспублікі першых 34 эканамістаў вышэйшай кваліфікацыі для прамысловасці, фінансавых і крэдытных органаў. Першая дыпломная работа ў БДУ была абаронена выпускніком эканамічнага аддзялення Б.М. Каракулькам. Яму быў уручаны дыплом БДУ пад № 1. У чэрвені 1925 года дыпломы аб заканчэнні эканамічнага аддзялення атрымалі яшчэ 85 студэнтаў. Усяго за першыя дзесяць год Беларускі дзяржаўны універсітэт выпусціў больш за 300 эканамістаў.

Восенню 1925 года факультэт грамадскіх навук быў рэарганізаваны. З яго вылучыўся факультэт права і гаспадаркі (праўгас) з чатырма эканамічнымі аддзяленнямі: адміністрацыйна-прамысловым, кааператыўным, планава-статыстычным, фінансавым.

У 1926/1927 годзе ў навучальны план былі ўключаны палітычная эканомія і эканамічная палітыка. У 1927 годзе ў БДУ адкрылі аспірантуру.

У 1929 годзе факультэт права і гаспадаркі быў падзелены на два — факультэт права і савецкага будаўніцтва і факультэт народнай гаспадаркі. У наступным годзе прадметныя камісіі былі расфарміраваныя, і ўся навукова-метадычная і навукова-даследчая работа сканцэнтравалася на кафедрах.

У 1931 годзе на эканамічных аддзяленнях факультэта народнай гаспадаркі навучаліся 700 студэнтаў. У сувязі з патрэбамі народнай гаспадаркі Беларусі ў тым самым годзе на базе гэтага факультэта арганізаваліся тры самастойныя вышэйшыя навучальныя ўстановы: планава-эканамічны інстытут, фінансава-эканамічны інстытут, інстытут спажывецкай кааперацыі. Але такія дробныя ВНУ, як высветлілася, не маглі забяспечыць комплексную падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі.

І вось 20 мая 1933 года Савет народных камісараў прыняў Пастанову № 721 "Аб арганізацыі Інстытута народнай гаспадаркі ў г. Мінску", у якім была сканцэнтраваная падрыхтоўка эканамістаў для Беларусі.

Так завяршыўся першы этап станаўлення эканамічнай адукацыі ў Беларусі на базе БДУ.

*Тадэвуш АДАМОВІЧ,*
*дацэнт кафедры эканамічных навук,*
*кандыдат эканамічных навук*



# ВЫВУЧАЦЬ ПАЛІТЫКУ ЦІ ЗАЙМАЦЦА ЁЙ?

*(Заканчэнне. Пачатак на стар. 3)*

дакладчыкаў на семінары запрашаюцца палітолагі, гісторыкі, эканамісты...

Апрача таго, члены асацыяцыі бралі актыўны ўдзел у разнастайных міжнародных канферэнцыях, семінарах і летніх школах. У Швецыі і Польшчы, Венгрыі і Украіне, Партугаліі і Славакіі ведаюць РАСП. У далейшым асацыяцыя плануе пашыраць свае міжнародныя кантакты. Да таго ж, РАСП з'яўляецца актыўным членам Беларускага Нацыянальнага савета маладзёжных і дзіцячых аб'яднанняў і пастаянна прымае ўдзел у мерапрыемствах, якія арганізоўвае ён і іншыя грамадскія аб'яднанні. У дадатак да гэтага, асацыяцыя супрацоўнічае з нядаўна створанай Беларускай Акадэміяй палітычных навук, прэзідэнтам якой быў выбраны С. Рашэтнікаў.

**— Існуе думка, што палітыка — брудная справа. Чаму вы вырашылі вывучаць яе прафесійна? Чым яна прываблівае вас?**

— Палітыка па сваёй сутнасці закранае ўсе сферы жыцця грамадства. І, безумоўна, комплекснай навукай, якая аб'ядноўвае вывучэнне эканамічных, сацыяльных і палітычных аспектаў нашага жыцця, з'яўляецца паліталогія. Без вывучэння палітыкі, лічым мы, узняць палітычную культуру насельніцтва на высокі ўзровень немагчыма.

**— Вы хочаце рабіць палітычную кар'еру ці збіраецеся назіраць за палітычнымі працэсамі збоку?**

— Я ўпэўнены, што цяперашнія члены нашай асацыяцыі ў недалёкай будучыні зоймуць значныя пасты ў палітычнай сістэме нашага грамадства і ў разнастайных грамадскіх інстытутах. Але зараз мы маем на ўвазе навуковую кар'еру. Усе мы цудоўна разумеем, што менавіта навукоўцы звычайна бываюць запатрабаванымі дзяржавай.

*Юлія ШЧАРБАКОВА*

# КАБ ЖЫЛОСЯ ЛЯГЧЭЙ

Вось і зноў у наш універсітэт паступілі новыя маладыя людзі. Зараз яны першакурснікі, і ім трэба будзе разам з навучаннем праяўляць сябе і ў новым сацыяльным асяродку. Трэба ўлічваць, што фарміраванне асобы праходзіла ў сістэме "сям'я — школа — блізкае асяроддзе", што значна адрозніваецца ад той, у якой студэнту неабходна будзе асвойвацца пасля паступлення ў ВНУ. А яшчэ больш актуальнай гэтая праблема робіцца для студэнтаў, якія будуць жыць у інтэрнаце. Ці зможа студэнт першага курса паспяхова адаптавацца ў новых умовах навучання, узаемадзеяння з іншымі, пражывання?

Даследаванні паказваюць, што першакурснікі адчуваюць вялікія цяжкасці ў працэсе адаптацыі. Гэтая праблема знаходзіцца пад пільнай увагай з боку выкладчыкаў, куратараў, сацыяльных педагогаў, псіхолагаў. Мы спынімся на праблемах адаптацыі першакурснікаў, якія жывуць у інтэрнаце.

Першы момант, які выклікае праблему ў адаптацыі, звязаны менавіта са змяненнем умоў пражывання. Першакурснік сутыкаецца з новымі патрабаваннямі, якія і вызначаюць яго знаходжанне ў інтэрнаце. Сутыкнуўшыся з імі ўпершыню, першакурснік можа не адразу зразумець іх сэнс і прызначэнне. Таму на практыцы, як правіла, гэта вядзе да канфліктаў як з адміністрацыяй інтэрната, так і з суседзямі па пакоі. Напрыклад, у жыхароў аднаго пакоя зусім розныя рэжымы дня (хтосьці ўстае рана, а хтосьці лічыць за лепшае даўжэй паспаць). Няўзгодненасць, недамоўленасць паміж жыхарамі можа прывесці да міжасабовых канфліктаў.

Другая праблема тычыцца змянення кола зносін. Галоўны момант заключаецца ў тым, што першакурснік пачынае актыўна ўзаемадзейнічаць з выкладчыкамі і новымі сябрамі. Але на працягу гэтага працэсу могуць узнікнуць так званыя памылкі зносін. У сувязі з імі ўзнікаюць праблемы асобаснай трывожнасці, неадэкватных паводзін, эмацыянальныя і камунікацыйныя цяжкасці.

Сур'ёзнай праблемай з'яўляецца таксама ўменне студэнтаў-першакурснікаў самастойна арганізоўваць сваё жыццё ў новых умовах так, каб аптымальна ўдалося сумясціць навучанне, побыт і адпачынак. І студэнтам давядзецца тут разлічваць амаль выключна на свае сілы. А гэта даволі складаны працэс, падчас якога могуць узнікнуць разнастайныя цяжкасці. Вельмі важна навучыцца пераадольваць цяжкасці, прадбачыць магчымыя праблемы, шукаць спосабы іх вырашэння і, нарэшце, цаніць жыццёвы вопыт.

Неабходна заўважыць, што цэнтральнае месца ў працэсе адаптацыі для студэнтаў займае арганізацыя першакурснікамі самападрыхтоўкі. Поспех навучання ў ВНУ грунтуецца менавіта на такой самападрыхтоўцы, і толькі ад арганізаванасці самога студэнта залежыць, наколькі выдатна будзе ісці навучанне.

У заключэнне хочацца даць першакурснікам некалькі парад.

♦ Памятайце, што ў інтэрнаце ёсць свае правілы пражывання, якія вы абавязаны выконваць. Але акрамя абавязкаў у вас ёсць і правы, якія вы таксама павінны ведаць і ўмець імі карыстацца, — гэта ў вашых жа інтарэсах.

♦ У інтэрнаце ёсць людзі, якія вам дапамогуць у розных сітуацыях. Перш за ўсё гэта сацыяльныя педагогі. Акрамя таго, у студэнцкім гарадку працуе сацыяльна-псіхалагічны цэнтр, куды вы заўсёды можаце звярнуцца.

♦ У вас з'явілася новае кола зносін, і цяпер вельмі важна навучыцца будаваць зносіны як з суседзямі па пакоі, так і з іншымі студэнтамі і супрацоўнікамі інтэрната. Калі ў вас узнікнуць у гэтай сферы праблемы, якія цяжка вырашыць самому, звярніцеся па дапамогу альбо да сацыяльнага педагога, альбо да псіхолага.

♦ Цяпер вы сталі цалкам самастойным. Навучыцеся планаваць свой час так, каб яго хапала і на навучанне, і на побыт. У інтэрнаце ёсць пакой самападрыхтоўкі і сацкультбыту. Пацікаўцеся іх часам працы.

♦ Памятайце, што неабходна правільна арганізаваць і запоўніць свой вольны час. Пра магчымасці яго арганізацыі пацікаўцеся ў педагога-арганізатара інтэрната.

Студэнцкія гады сапраўды з'яўляюцца самымі лепшымі, а студэнцкі інтэрнат часта называюць другім домам, у якім добрымі гаспадарамі з'яўляюцца самі студэнты. Таму толькі ад вас саміх залежыць, ці будзе ваша жыццё праходзіць цікава і з карысцю.

*Псіхолагі сацыяльна-педагагічнага цэнтра студэнцкага гарадка БДУ*

СПОРТПЛЯЦОЎКА

# ЛЕПШЫЯ ФУТБАЛІСТЫ – НА ГЕАФАКУ



Турнірная сетка чэмпіянату БДУ па футболе сярод першых курсаў зноў змянілася. І ўсё — з-за павелічэння колькасці факультэтаў. Цяпер іх у БДУ 16. Але ўдзельнічалі ў чэмпіянаце толькі 15 камандаў.

Удзельнікаў падзялілі на пяць груп. Каманды, якія занялі першыя месцы ў групах, гулялі за 1-5 месцы ў турнірнай табліцы. Тыя, хто апынуўся ў другім радку табліцы, — за 6-10, а каму зусім не пашчасціла — за 11-15 месцы.

Залатыя медаль, як і летась, атрымалі хлопцы з геафака. Даволі цікавая і змястоўная гульня. Сапернікаў сёлета ў іх не было. Цікава адзначыць той факт, што Дзяніс Высоцкі двойчы стаў чэмпіёнам сярод першакурснікаў. Летась на ўступных іспытах хлопцу не зусім пашанцавала. Таму сёлета ён зноў першакурснік, але цяпер ужо бюджэтнага навучання.

На другім месцы — гісторыкі. Гэта самая вялікая сенсацыя чэмпіянату. Апошнія гады гісторыкі ну зусім нічога не паказвалі ў гульні, а ў гэтым годзе ўпершыню выбраліся ў прызёры. Відаць, добра настроіў іх Васіль Мікалаевіч Юшко, адказны за гістарычны факультэт.

Трэція — радыёфізікі. Вышэй галавы гэтыя хлопцы скочыць не могуць, а вось вышэй юрыстаў, якія правальваюць другі чэмпіянат запар, — атрымалася.

І яшчэ адна маленькая не сенсацыя, а нечаканасць: 9-е месца журналістаў, якія два гады запар даволі ўпэўнена насілі тытул віцэ-чэмпіёнаў.

Так выглядае турнірная табліца:

1. Геафак
2. Гістфак
3. Радыёфізікі і электронікі
4. Юрфак
5. Фізічны
6. ФПМІ
7. Мехмат
8. Хімічны
9. Журфак
10. Біялагічны
11. Міжнародных адносін
12. Філалагічны
13. Спецфакультэт

Астатнія каманды былі знятыя.

*Вольга КУЛІКОВА*

# Паэзія ведаў



На тым вучнёўскім сшытку, што трапіў з рук у рукі да мяне ад выкладчыцы беларускай мовы, якая вядзе заняткі на геаграфічным факультэце, яшчэ па-школьнаму, яшчэ няўпэўненай рукой, але ўжо з добрай і такой зразумелай высокай студэнцкай амбітнасцю, мо ці ад ранку да вечара старанна пяром і чарнiламі выдрукавана-надпісана: Вадзім Зубрыцкі. "Універсітэцкае". Учора школьнік яшчэ, а сёння ўжо студэнт. "Універсітэцкае" — цыкл ягоных вершаў на беларускай і рускай мовах.

Я — не графолаг. Па почырку нікольki нам не дадзена ўведаць усё пра чалавека: нас гэтаму яшчэ не навучылі, ды нават і самі мы не ў стане ўлавіць імгненне азарэння псіхікі, ўспышку паэзіі, энергію душы, сляды разбуджанага пачуцця, абрысы здольнасці, зародак таленту. А ён жа, пэўна, тут, у гэтых словах.

Паэзія — заўжды вандроўка ў незнаёмае. У незнаёмы свет другога чалавека, у новыя мроі людской душы, у шматгучную гаму пачуццяў.

Нягледзячы на нашу дамоўленасць, ніякіх звестак болей пра сябе малады аўтар не даў. Але і без гэтага пасля знаёмства з вершамі нам стаў больш чым зразумелым і стан душы "маладога творцы", і накірунак думак, і шчырае жаданне адкрыць свой свет і свет у сабе. Пра Вадзіма Зубрыцкага мы ўжо чулі не аднойчы. Допісы і зацемкі, невялікія інфармацыйныя матэрыялы са святаў, з месца, так бы мовіць, падзей, пра вандроўкі, у якіх ён сам прымаў удзел — яго імя часта з'яўлялася на старонках нашай газеты.

Пра другога маладога аўтара, ці, дакладней сказаць, аўтарку, пачынаючую паэтку, студэнтку І курса філалагічнага факультэта аддзялення французскай мовы і літаратуры Алену Галаўнёву можна сказаць як пра ўважлівую і зацікаўленую слухачку на лекцыях. Па выразе твару яе і па засяроджаным позірку, прыкутым да лектара, па неабыякавых дапытлівых вочках, якія вось-вось гатовы "ўспыхнуць-узгарэцца" жаданнем ускінуць уверх руку, каб імгненна задаць пытанне, калі што незразумела ёй ці незнаёма, па вачах тых мы можам зверыць праўду нашых слоў і праўду пачуцця, трываласць нашых ведаў, універсітэцкі грунт. Гэтая студэнтка заўжды сядзіць справа ад кафедры каля саменькага акна...

Акна, за шклом якога віруе-кіпіць жыццё людское і той знаёмы-незнаёмы горад для яе.

Вершы могуць быць рознымі... І гаворка можа весціся не толькі пра тое, простая ці складаная сама думка ў творы, пра яго змест і тэму. Гэта абсалютна не важна. Мы чытаем верш і бачым зрокава той свет, пра які пішуць маладыя паэты, бо ў іх сэрцах і душах адбіваецца рэальнае святло рэальных падзей, у радках ажывае трапяткое і вечна жывое разбуджанае пачуццё. Ды ёсць яшчэ і іншы верш. Верш пазнання. Верш розуму. Паэзія ведаў. Так назавем мы гэтую творчасць студэнтаў. Дасюль мы глядзелі на жыццё вачыма саміх паэтаў і адкрывалі іх саміх. Гэта прамы шлях да суперажывання, да судакранання людскіх душ. Ды ёсць і іншыя шляхі спасціжэння карціны свету, шляхі пазнання, ведаў, шляхі адкрыццяў.

Маладыя людзі — яшчэ ўчарашнія школьнікі (пра гэта сведчаць іх вучнёўскія сшыткі вершаў), але ўжо размах іх крылаў і палёт душы даўно і трывала відавочна студэнцкі, бо ўжо за імі — наш родны моцны БДУ. Памятаеце, на тытуле першага "збору твораў" паэта-студэнта пазначана сакраментальнае і ганаровае "Універсітэцкае". Гэта ўсё думы запаветныя ды мары ўзнёслыя, пачуцці шчырыя, палёт высокі — ад сцен і аўдыторый нашых. Аднойчы падслуханая размова, калі маці "дакарала" абітурыентку, каб тая добра вучылася, кажучы, што тут, у БДУ, "ля вугла стоячы, ты большаму навучышся", чым дзесьці ходзячы штодня.

Навука не мучыць, а жыць вучыць. У вершах якраз можна бачыць тое, як спакваля, але ўпарта набіраюцца маладыя паэтычнай сілы, жыццёвага розуму, мудрасці вякоў — старадаўніх ведаў, як да іх няўхільна прыходзіць запаветны роздум і ўвага да пазнання, якое адыгрывае сёння ў іх адкрыцці свету найвялікшую ролю.

Чытаць тыя вершы няпроста. Можна хутчэй захапляцца феерверкам пачуцця. Але давайце ўчытаемся ў вершы-развагі, у вершы-роздум, у вершы-прызнанні, спасцігнем глыбіню трывог і радасцей, абсяг іх розуму, студэнцкага, пазнавальнага, асветнага, прасветлага. Паэзію ведаў...

...А дзесьці каля акна на чацвёртым радзе ва універсітэцкай аўдыторыі студэнтка ўважліва слухае чарговую лекцыю.

*Уладзімір НАВУМОВІЧ,*
*загадчык кафедры беларусазнаўства БДУ, дацэнт, член Саюза беларускіх пісьменнікаў*

## Вадзім ЗУБРЫЦКІ

### На роднай мове

Мой першы верш на роднай мове.
Тэматыку так цяжка падабраць:
Хачу сказаць я шчыра пра надвор'е,
Што сонца — цёпла, хочацца гуляць.

Гуляць хачу па родным краі,
Па тых мясцінах, дзе радзіўся, рос.
Зямлі хачу сказаць свой
цёплы "Дзякуй!"
Я за палеткі, дрэвы, пасмы ніцых лоз.

За тое, што яна ў нас такая,
Якая ёсць, любімая зямля,
Што краскамі сягоння зацвітае,
А заўтра будзе тут пара жніва.

Хацеў пачуць я мовы роднай словы,
На ёй з каханаю, з сябрамі гаварыць.
Але, на жаль, няма такой дамовы —
На роднай мове наш народ маўчыць...

Будзь, родны край, навек багаславёны!
Каб войны не гулялі кагадзе,
Каб на цябе ніхто не слаў праклёны,
Не быць табе каб зноўку ў бядзе.

Каб захаваў сваю ты незалежнасць,
Каб з карты свету болей не знікаў.
Каб твой народ адчуў з табою еднасць
І ўсёй душой пра лёс і будучыню дбаў.

### Роздум пра Беларусь

Я гляджу на белыя бярозы
Беларусі роднае маёй.
Колькі ты ліла, зямліца, слёзы,
Колькі гора пранеслося над табой...

Бачыла ты на Нямізе сілу,
І татарам ты адпор дала,
І ў час ліхі сярэднявечча
Грозных крыжакоў перамагла.

Па палетках поўзалі тут танкі,
І свісталі кулі-салаўі,
Тут шугалі войнаў дзвюх маланкі,
Але ты й народ — перамаглі.

Над табой цяпер блакіт нябёсаў,
І аблокі белыя плывуць.
Дык няхай для росаў будуць косы,
Хай яны на бітву не ідуць.

Хай лясы крывёй не чырванеюць,
Хай суніцы чырванню гараць.
Хай вятры палеткам вольным веюць,
Хай бярозы белымі стаяць.

♦♦♦

## Алена ГАЛАЎНЁВА

### Радзіме

Усё мне міла на маёй Радзіме:
Гоман кветак і пошум крыніц.
Усё жыццё ёй аддаць, адзінай,
За той смак краснабокіх суніц.

За ласкавыя рэчкі, азёры,
За магутныя дрэвы, лясы,
За лугі і палёў тых прасторы...
Больш нідзе няма гэткай красы!

Спевы птушак у раніцу светлую
Абуджаюць Радзіму маю.
І за радасць бясконцую гэтую
Я Радзіму аддана люблю.

**У КАМЕННЫМ ЦАРСТВЕ**

# Зоркавы сын прыроды

Вандроўка па самым цудоўным і загадкавым свеце камянёў працягваецца. У каменным царстве музея землязнаўства на паліцах вітрын месяцца рубіны.



Сярод іх ёсць тры каштоўныя крышталікі з М'янмы, дзе здабываюцца самыя лепшыя рубіны ў свеце. Пад шклом у вітрыне яны займаюць вельмі сціплае месца, але калі іх бярэш у рукі і праменьчык святла кранае самацвет — пачынаецца казка, трапляеш у чароўны свет, дзе струменіцца ўсё навокал.

Мне згадваецца казка П. Яршова пра Канька-Гарбунка: "Вочы яхантам гарэлі..." Яхантам называлі рубін на Русі ў даўніну.



Гэта самы чырвоны сярод каштоўных і самы каштоўны сярод чырвоных камень самай высокай катэгорыі. Рубін атрымаў сваю назву па колеры (ад лац. Rubeus — чырвоны).

У гэтага мінерала самая дасканалая і шчыльная структура, па ўласцівасцях ён знаходзіцца побач з алмазам. Камень мае высокую цвёрдасць. Хром, які змяшчаецца ў ім, не толькі дае афарбоўку, але і выпраменьвае святло. Вось чаму рубіны такія



прывабныя і так цудоўна ззяюць, як паходні, пераўзыходзячы нават водбліскі агню.

Акрамя таго, у рубіна ёсць яшчэ адна каштоўнасць — ён з'яўляецца ідэальнай асновай для вытворчасці лазераў ці аптычных квантавых генератараў. Гэта складаныя прыборы, якія могуць быць крыніцай святла вельмі вялікай яркасці. Першы рубінавы лазер быў створаны ў 1960 годзе.

Мне вельмі падабаюцца самыя чароўныя "зоркавыя" рубіны са з'явай астэрызму. Што гэта такое? У камені выразна можна ўбачыць светлую ззяючую зорачку з трыма, шасцю ці дванаццаццю праменьчыкамі. Часцей промні злёгку расплывістыя, і тады камень называецца жыразоль. Як толькі павернеш камень, крыху нахіліш, дык зорачка мягка слізгане па паверхні паўсферы, калыхнецца назад і зноў апынецца наверсе. Тлумачыцца гэта з'ява ўрослымі крышталікамі другога мінерала — рутылу.

Па старажытных паданнях, рубін лічыўся гаючым, ім лекавалі сэрца, мозг і паляпшалі памяць. Рубін заўжды быў у пашане. Больш за паўсотню буйных рубінаў ззяе ў чэшскай дзяржаўнай рэліквіі — залатой Святавацлаўскай кароне. Гэта адна з самых старажытных і прыгожых карон у Еўропе, захоўваецца яна ў скарбніцы Пражскага Града.

У залатой скарбонцы Маскоўскага Крамля рэгаліі рускіх цароў упрыгожаны мноствам яхантаў, напрыклад, скіпетр — 96 рубінаў, сімвал імперыі залаты шар (дзяржава) — 123 рубіны, на знакамітай шапцы Манамаха — буйныя і прыгожыя чатыры рубіны і г.д.

Сярод найбольш каштоўных скарбаў еўрапейскіх манархаў у XVII — XVIII стагоддзях на першым месцы стаяць рубіны. З курынае яйка быў рубін манарха Аўстра-Венгрыі Рудольфа II, з галубінае — рубін Кацярыны II,



падарунак шведскага караля Густава. У Брытанскім музеі ў Лондане захоўваецца крышталь м'янмскага рубіну масай 3450 каратаў, лепшым сярод неапрацаваных лічыцца "Рубін Эдуарда" масай 167 каратаў. Адзін з найбуйнейшых апрацаваных рубінаў знаходзіцца ў прыватнай калекцыі ў Індыі.

Асноўныя радовішчы рубінаў знаходзяцца ў М'янме, Шры-Ланцы, Таіландзе, Танзаніі, Аўстраліі, Індыі.



Магоцкі раён у М'янме лічыцца найбольш старажытным і галоўным па здабычы каштоўных камянёў. Падобнае радовішча рубінаў знаходзіцца ў Таіландзе (Пайтнаван). З 1928 года выяўлена новае радовішча ў цэнтральнай Аўстраліі (каля Аліс-Спрынс). Па сваіх запасах гэтае радовішча з'яўляецца трэцім у свеце. Рубіны тут высокай якасці і прыгожага колеру. Сустракаюцца рубіны ў ЗША і Расіі.

Цэны на рубіны ў залежнасці ад колеру, чысціні і якасці агранкі на сусветным рынку вагаюцца ад 500 да 3000 долараў за карат. М'янмскія рубіны высокай якасці зараз ацэньваюцца яшчэ вышэй.

Тыя камяні чырвонага колеру, што мы бачым на паліцах нашых ювелірных крамаў пад назвай рубінаў, усе сінтэзаваныя. Вырошчваюць штучныя рубіны з 1892 года, першапраходцам гэтай справы лічыцца французскі навуковец Агюст Вернэйль.

*Валянціна СМАЛЯКОВА,*
*геолаг музея*
*землязнаўства БДУ*

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*
*Ум. друк. арк. 1*
*Падпісана да друку ў 12.00*

*14 кастрычніка*
*Зак. 710.*
*Т. 1000 экз.*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 2206827.*

**Рэдактар Т. М. КАЗАК**

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*

*Камп'ютэрная вёрстка Вольгі Сырыч*